Спадзяёмся, што папярэдняя наша праца зьяўляецца выстарчаючым залогам таго, што і далейшая праца будзе плённай і карыснай для мэты ўтварэньня сапраўднай беларускай пролетарскай літаратуры.

З таварыскім прывітаньнем да Вас

***У. Дубоўка*** (падаў заяву аб выхадзе з „Маладняка“ 26.IV.26 г.)
***Я. Пушча*** (Плашчынскі)
***Кузьма Чорны*** (М. Раманоўскі)
***А. Бабарэка***
***З. Бядуля*** (далучаюся да п. 6)
***Крапіва*** (Атраховіч)

*26 траўня 1926 г.*
*г. Менск*

## № 13

## [Адказ першага сакратара ЦК КП(б)Б А. Крыніцкага пісьменьніку А. Бабарэку на зварот групы маладнякоўцаў у бюро ЦК КП(б)Б ад 26 траўня 1926 г. з просьбай дазволіць утварэньне самастойнага літаратурна-мастацкага аб'яднаньня]

*Менск. 10 жніўня 1926 г.*
*Тав. А. Бабарэку.*

Дарагі таварыш!

На ліст групы поэтаў і пісьменьнікаў у бюро ЦК ад 26 траўня 1926 г. паведамляем, што ўход Вашай групы мажлівы на падставе прынцыпаў, аб якіх дамовіцеся з аддзелам ДВЦ ЦК КПБ.

Адказам па сутнасьці Вашай заявы будзе рэзалюцыя бюро ЦК, з якою Вы можаце азнаёміцца ў ЦК КПБ.

Просім паведаміць рэшту таварышаў, падпісаўшых заяву.

З камуністычным прывітаньнем
Сэкратар ЦК КП(б)Б *А. Крыніцкі*

## № 14

## Пратакол
## арганізацыйнага сходу установаўцаў беларускага літаратурна-мастацкага згуртаваньня „Узвышша“.

*20 жніўня 1926 г.*

Прысутнымі былі: К. Атраховіч (Крапіва), А. Бабарэка, П. Глебка, Ул. Дубоўка, А. Каратай (Лужанін), С. Плаўнік (З. Бядуля), Я. Плашчынскі (Пушча), М. Раманоўскі (К. Чорны), С. Серада (Дарожны) і В. Шашалевіч.